даюць свае кніжачкі ў сектах бясплатна. Толькі бяры, чытай, адурманьвайся. Але патрэбна павысіць падаткі ад продажу кніг наступнай тэматыкі: фантастыка, дэтэктыўшчына, неспецыяльная замежная...

3. Неабходныя народнагаспадарчаму комплексу кнігі ў недзяржаўных выдавецтвах дзяржаве патрэбна падтрымліваць. Нельга пускаць усё на самацёк.

4. Варта прыдумаць нейкую кару кнігагандлёвым арганізацыям за непрапаганду беларускамоўнай кнігі. Можам вырадзіцца як нацыя, калі не будзем чытаць кнігі на роднай мове.

5. Распрацаваць сістэму ўліку непрададзеных беларускамоўных кнігаў — назваў і экземпляраў.

6. Выдавецтвам патрэбна часцей аб'ядноўвацца пры выданні той ці іншай кнігі. Нават з дапамогаю Дзяржкамвыда.

7. Варта часцей арганізоўваць продаж нашай кнігі ў краіны далёкага замежжа для перавыдання. Некалі была добрая завядзёнка — вы бярэце нашу кнігу для перавыдання, мы бяром вашу. Нельга так зрабіць, не выходзіць, а кнігу замежную трэба тут перавыдаць, то можна ўзяць іхнія дзве, а яны хай нашу возьмуць адну. А то мы і тут праспім, прайграем.

## Сучаснае недзяржаўнае кнігавыданне для дзяцей у Беларусі

*Валянціна БІГЕЗА, канд. філал. навук, дацэнт кафедры дакументазнаўства і бібліяграфіі Беларускага універсітэта культуры*

Большасць недзяржаўных выдавецкіх структураў, якія выпускаюць дзіцячую літаратуру ў нашай краіне, з'явіліся ў 1991 г. Асобныя, праіснаваўшы адзін-два гады, не вытрымалі канкурэнцыі. Іншыя, канчаткова выбраўшы свой сектар рынку, існуюць і сёння. Сярод іх: "Сказ" (мастацкая і навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей), "PICORP" (выданні рэлігійнага зместу для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў), "Полипринт" (навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей), "МЕТ" (мастацкая, навучальная, навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей), "Асар" (навучальная і мастацкая літаратура для дзяцей), "Мока-Имидж", "Полифакт" (фальклорныя творы для дзяцей) і інш.

Доля выдавецкіх недзяржаўных структураў у выданні кнігі для дзяцей узрастае. Калі ў 1991 г. гэта былі адзінкавыя выданні, то ў 1992-м было выдадзена 34 назвы, у 1993 г. — 104, у 1994 — 124, у 1995 г. — 224 назвы кніг. У той жа час (1995) дзяржаўнымі выдавецтвамі было выдадзена толькі 78 назваў. Гэта сведчыць пра тое, што ў рэспубліцы ўжо створана альтэрнатыўная дзяржаўнай сістэма выдання літаратуры для дзяцей.

Аналіз тыражнасці выданняў дзяржаўных і недзяржаўных выдавецкіх структураў сведчыць пра іх агульную тэндэнцыю да паніжэння тыражу дзіцячых кніг. Так, у 1992 г. сярэдні тыраж адной кнігі дзяржаўных выдавецтваў склаў 83,5 тыс. экз., а недзяржаўных — 194,8 тыс. экз., у 1993 г. — адпаведна 62,2 тыс. экз. і 168,2 тыс. экз., у 1994 г. — 33,6 тыс. экз. і 57 тыс.экз. У 1995 г. гэтыя лічбы яшчэ паменшыліся — 31,9 тыс.экз. у дзяржаўных і 52 тыс. экз. у недзяржаўных выдавецтваў.

Дынаміка выдання дзіцячай мастацкай літаратуры па яе чытацкім прызначэнні і відавой структуры для дашкольнікаў мянялася наступным чынам: у 1992 г. было вы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

дадзена 21,4% ад усяго аб'ёму мастацкай літаратуры, у 1993 — 24,3%, у 1994 — 29,7%, у 1995 г. — 33,4%. Разам з павелічэннем колькасці назваў адначасова прасочваецца тэндэнцыя памяншэння тыражнасці: сярэдні тыраж адной кнігі ў 1992 г. склаў 126,6 тыс. экз., а ў 1995 г. — 57,4 тыс. экз. Такі ж малюнак назіраецца і адносна выданняў для малодшых школьнікаў.

Вопыт работы вытворчага прадпрыемства "МЕТ" ацэнены экспертамі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця. Выдавецтва стварыла цэлую праграму "Мая першая бібліятэка". Выдаўцы супрацоўнічаюць з псіхолагамі і гэта дае свой плён.

Рэкламна-выдавецкая фірма "Сказ" выпускае для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту кніжкі-цацкі, кніжкі-размалёўкі, кніжкі-гульні. Ёсць у выдавецкай фірмы і сумесныя праекты з фірмамі далёкага замежжа.

Што да выданняў мастацкай літаратуры для сярэдняга і старэйшага ўзросту, то колькасная характарыстыка тут больш сціплая. У 1995 г. недзяржаўныя выдавецтвы выпусцілі толькі каля 30% дзіцячай літаратуры. Літаратурны вакуум вакол падлеткаў запаўняюць на дадзены час у асноўным дзіцячыя фантастычныя баевікі. Іх выданнем займаецца, напрыклад, ТАА "Харвест" (серыя "Библиотека детской фантастики").

На выданні дэтэктыўнай і прыгодніцкай літаратуры спецыялізуюцца выдавецтвы "Эридан": серыі "Гангстерский детектив", "Фантастика, приключения, детектив"; "Паблисити" — серыя "Лучшая фантастика мира"; "Сталкер" — "Библиотека приключений и фантастики" і інш. У серыі ўключаны зборнікі і зборы твораў замежных аўтараў.

Для сярэдняга і старэйшага ўзросту шырока прадстаўлена даведкавая і энцыклапедычная кніга. Яе выдаюць ТАА "Харвест" ("Я познаю мир"), фірма "Валев"("Всё обо всём"), "Полипринт" (Бутромеев В.П. "Детский Плутарх"), "Макбел"("Что есть Что") і інш.

Асобнай увагі заслугоўвае выпуск навучальнай кнігі. Сярод іншых недзяржаўных выдавецкіх структураў неабходна адзначыць дзейнасць выдавецтва "Асар", для якога навучальная літаратура з`яўляецца профільнай. Ім выдадзены шэраг дапаможнікаў і падручнікаў, якія вызначаюцца высокай культурай друку і маюць сертыфікат "экалагічна чысты прадукт", выдадзены Міністэрствам аховы здароўя.

Нельга не адзначыць дзейнасць недзяржаўных выдавецтваў і прыватных выдаўцоў па выпуску беларускамоўных выданняў. Сярод іх: "Сталкер", "PICORP", "Талер", "Еўрапейская кніга", "Асар", "Хата", "Лазурак", "Белая Русь", "Родны кут"; Альхімовіч, Ванееў, Велько, Гушча, Паўлаў і інш.

Адной з тэндэнцый у дзейнасці сучасных недзяржаўных выдавецкіх структураў з'яўляецца іх супрацоўніцтва з дзяржаўнымі выдавецтвамі, пры гэтым паспяхова вядзецца пошук пачынаючых аўтараў ("Юнацтва", "Асар" — Трахименко С. "Игры капризной дамы").

Дзейнасць асобных недзяржаўных выдавецкіх структураў і прыватных выдаўцоў сягае еўрапейскага ўзроўню. Яны ўспрымаюць сваю работу не толькі як камерцыйную, але і як місію.

Для далейшага паляпшэння дзейнасці выдавецтваў па выпуску кніг для дзяцей мэтазгодна іх каардынацыя, складанне зводных планаў, паказальнікаў, што дазволіць пазбегнуць празмернай перавытворчасці асобных відаў літаратуры, дублетнасці і запоўніць пакінутыя без увагі сектары кніжнага рынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ